**Праекты.** Год якасці для Беларускага саюза мастакоў — гэта магчымасць паказаць вялікія выставачныя праекты. Аб гэтым заявіла першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч на прэс-канферэнцыі «Выставачны сезон — 2024. Новыя творчыя праекты беларускіх мастакоў», перадае карэспандэнт БелТА. Мастацтвазнаўца паведаміла, што выставачны сезон Саюза мастакоў адкрые праект «1,10 квадрата», прысвечаны 110-годдзю «Чорнага квадрата» Казіміра Малевіча. «Ён будзе складацца з дзвюх частак. На пляцоўцы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі мы пакажам віцебскіх мастакоў, якія займаюцца тэматыкай супрэматычных кампазіцый. Другая частка будзе прадстаўляць мастакоў усіх абласцей. Тэматыка гэтага праекта вельмі простая. Быў «Чорны квадрат», і ёсць яго трансфармацыі ў сучасным мастацтве, яны могуць быць розныя. Гэта неабавязкова жывапіс, гэта могуць быць любыя арт-аб'екты — усё тое, што сведчыць аб руху наперад у мастацтве», — дадала першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў.